**Гісторыка-культурныя помнікі Гродна: страчаная спадчына: бібліяграфічны даведнік: [Тэкст] / уклад. А.Б. Сяўрук, рэд. І.М. Ілюшына, Н.Ю. Баброва. – Гродна, 2012. – 27с.**



**У горадзе Гродна шмат помнікаў вартых увагі гараджан і гацей, але многія набыткі стагоддзяў не захаваліся да нашых дзён. На працягу ўсёй гісторыі Гродна суправаджалі войны, пажары і іншыя гістарычныя калізіі, вынікам якіх была ў тым ліку і страта помнікаў гісторыі, сведчанні аб якіх засталіся толькі на старонках кніг. Дадзены даведнік ствараўся з мэтай збору і сістэматызацыі фактаграфічнай і бібліяграфічнай збору і сістэматызацыі інфармацыі пра некаторыя страчаныя помнікі Гродна. Даведнік разлічаны на шырокае кола карыстальнікаў.**

## Гродзенская Верхняя царква



Помнік мураванага дойлідства XIV – пач. XV ст. Пабудавана на месцы Гродзенскай Ніжняй царквы. Часткі пабудовы выяўлены Ю.Ядкоўскім у 1931 – 37 гг. У час археалагічных раскопак на тэрыторыі Гродзенскага Старога замка, у 1939 г. перанесены ў спецыяльны павільён. Захаваліся: усходняя частка сцен (выш. 1 – 1,5 м.), частка паўднёвай сцяны з паўночна-заходнім вуглом, унутраны слуп. Рэшткі царквы даюць падставу меркаваць, што гэта быў квадратны ў плане (8,8x8,8) са зрэзанымі вугламі бесстаўповы храм з паўкруглай апсідай. У муроўцы сцен выкарыстоўваліся тонкая і "брусковая" цэглы (сярэдзіна сцен запаўнядася каменем). Унутры бакавых частак апсіды выяўлены аркі таўшчынёй у 1-2 цагліны. Звязачным матэрыялам была вапна хз дабаўленнем драблёнай цэглы і дробнага пяску. Муроўка пераважна

старчаковая. Падлога была з цэглы. Першапачатковае перакрыццё царквы было драўлянае, пазней – скляпеністае на нервюрах. Пасля перабудовы храм накрыты чырвонай чарапіцай у форме плоскіх пласцін. Верхняя частка сцен упрыгожана крыжападобнай цэглай. Рэканструкцыю царквы выканалі: у 1938 г. Т.Андрыёнчык, у 1965 Абрамаўскас, у 1987 Ф.Селязнёў, Р. Сташкевіч, А. Трусаў. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Верхняя царква / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996 – С. 26.
- Алісейчык, У.В. Гродзенская Верхняя царква / У.В. Алісейчык // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-ці т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 178.
- Воронин, Н.Н. Верхняя церковь / Н.Н. Воронин // Воронин Н.Н. Древнее Гродно. (По материалам археологических раскопок 1932 – 1949 гг.) / Н.Н. Воронин. – Москва, 1954. – С. 183.
- Габрусь, Т.В. [Верхняя царква ў Гродне] / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 1. ІХ – XIV стст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2005. – С. 220.
- Габрусь, Т. У цянётах “варварскага мастацтва” / Т. Габрусь // Габрусь Т. Саборы помняць усё / Т. Габрусь. – Мінск, 2007. – С. 21.
- Гродзенская Верхняя царква // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. –Т. 5. - С. 423.


## Гродзенская зала сеймаў

Існавала ў Гродне ў XVIII – XIX стагоддзях. Была пабудавана ў 1726 годзе ў двары Гродзенскага Каралеўскага палаца і злучалася з ім 2-павярховымі П-падобнымі ў плане драўлянымі карпусамі, якія абкружалі вялікі двор. Пры будаўніцтве залы былі выкарыстаны мураваныя сцены жылога дома Сапегаў, размешчанага ў тыльнай частцы двара. Пабудова ўключала вялікую базілікальную залу, раздзеленую ў падоўжным і папярочным напрамках на два нефы, ўваходны вестыбюль з лесвіцай і памяшканне для кур’ераў. Сярэдні, найбольш шырокі неф меў большую вышыню і асвятляўся праз размешчаныя над бакавымі нефамі вокны. У глыбіні залы на ўзвышэнні знаходзілася крэсла караля. Бакавыя нефы, у якіх знаходзіліся балконы, былі злучаны з цэнтральным вялікімі праёмамі, перакрытымі пакатымі аркамі. Унутраная аздоба залы характэрная для архітэктуры ракако – сцены чляніліся высокімі пілястрамі, філёнгамі, былі ўпрыгожаны размалёўкай і скульптурнымі рэльефамі ў мудрагеліста выгнутых рамах, вокны афармлены ліштвамі складанай формы. Фасад з боку ўнутранага двара меў тры ярусы аконных праёмаў. Першы ярус хаваўся за аркадамі абходнай галерэі. Другі складаўся са шчыльна згрупаваных і

аформленых ліштвамі з сандрыкамі вялікіх акон, якія засталіся ад старой пабудовы Сапегаў (некаторыя былі замураваны). Трэці ярус складаўся з праёмаў верхняга святла цэнтральнага нефа, раздзеленых на фасадзе пілястрамі. На першым паверсе размешчаных навокал двара П-падобных карпусоў знаходзілася дэкарыраваная аркамі абходная галерэя, памяшканне абслугі і варты.

**Бібліяграфія**

Марозаў, В.Ф. Гродзенская зала сеймаў / В.Ф. Марозаў // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 168.

- Гродзенская зала сеймаў // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. –Т. 5. - С. 426.

## Гродзенская ніжняя царква

Помнік старажытнага дойлідства. Належыць да перыяду станаўлення Гродзенскай школы дойлідства, майстрамі якой і была пабудавана ў XII стагоддзі.

Знаходзілася на тэрыторыі Гродзенскага Старога замка. К сярэдзіне XIII ст. разбурылася (у выніку пажару 1183 г. і недасканалай канструкцыі фундаментаў). У працэсе археалагічных раскопак 1931 – 1934 гг. І 1949 г. (вяліся Ю. Ядкоўскім і М. Вароніным) выяўлены яе руіны пад фрагментамі больш позняй Верхняй царквы. Часткова захаваліся рэшткі сцен (месцамі



выш. да 3,5 м.), фрагменты падкупальных слупоў і элементы дэкаратыўнага ўпрыгожання. Сцены прамавугольнай у плане пабудовы (16, 8 х 11, 6 м. без апсіды) выкладзены з адносна тонкай плінфы на вапнавым растворы ў тэхніцы роўнаслаёвай муроўкі з выкарыстаннем вялікіх камянёў. У верхнія часткі сцен і скляпенняў умураваны збаны-галаснікі (іх гарлавіны павернуты да інтэр’ера), што рабіла лягчэйшымі сцены і адначасова паляпшала акустыку. Паводле плану гэта быў 4-стаўповы храм тыпу ўпісанага крыжа без нартэкса з развітай алтарнай часткай.

У арганізацыі ўнутранай прасторы дакладна процістаялі алтарнай частка і наос, увянчаны купалам; у заходняй частцы наоса знаходзіліся хоры (да іх вялі ўсходы, што былі ў паўднёва-заходнім вугле храма). Вонкавы сегментападобны контур цэнтральнай апсіды (паўцыркульная ў інтэр’еры) нязначна выступаў за межы прамавугольнага плана; бакавыя апсіды звонку не выяўлены. Сцены знадворку і ўнутры расчлянёы лапаткамі, па вуглах яны



зрэзаны (як і падкупальныя слупы ), вуглы знадворных лапатак скруглены. Фасады аздоблены паліраванымі і неапрацаванымі рознакаляровымі камянямі, маёлікавымі квадратнымі пліткамі і паліванай чашападобнай кафляй. Сцены ўнутры не мелі размалёўкі. Галоўнае ўпрыгожанне інтэр’ера – маёлікавая ўзорыстая падлога і алтарная перагародка. Для падлогі выкарыстоўваліся пліткі 17 відаў рознага фармату і 3 колераў (жоўтая, зялёная і карычневая). Падлога мела пераважна шахматны малюнак, месцамі ўводзіўся ўзор у выглядзе хваста ластаўкі з жоўтых і карычневых плітак. Найбольш складаны быў узор цэнтральнай часткі наоса: упісаныя ў квадраты кругі з арнаментальнымі крыжамі ўсярэдзіне абрамлялі перакрыжаваныя шырокія жоўта-зялёныя плеценыя стужкі (палоскі). Захаваліся дэталі багата ўпрыгожанай драўлянай алтарнай перагародкі: пазалочаныя медныя лісты з выгравіраванымі выявамі апосталаў і святых у абрамленні кругоў са складаным раслінным і плеценым арнаментам. Помнік рэспубліканскага значэння.

**Бібліяграфія**


- Алісейчык, У.В. Гродзенская Ніжняя царква / У.В. Алісейчык // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 181.
- Аляксееў, Л.В. Верхняя царква / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л. В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 20.
- Воронин, Н.Н. Нижняя церковь / Н.Н. Воронин // Воронин Н.Н. Древнее Гродно; (По материалам археологических раскопок 1932 – 1949 гг.) / Н.Н. Воронин – Москва, 1954. – С. 105.
- Габрусь, Т.В. [Гродзенская Ніжняя царква] / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 1. IX – XIV ст.ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2005. – С. 190.
- Гродзенская Верхняя царква // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. –Т. 5. - С. 428.
- Кулагін, А.М. Ніжняя царква / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін.- Мінск, 2007. – С.484.

- Рэшткі маёлікавай падлогі XII стагоддзя. Ніжняя царква, Гродна : іл № 4 [Ізаматэрыял] // Ганецкая І.У. Маёліка на Беларусі ў XI – XVIII ст.ст. / І. У. Ганецкая. – Мінск,1995. – [3 с. : іл.].
- Рэшткі Ніжняй царквы / У.В. Алісейчык, Я.Г. Звяруга, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, А.А. Трусаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 78.
- Слюнчанка, В.Р. Гродзенская Ніжняя царква / В.Р. Слюнчанка // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 168.
- Ткачоў, М.А. Старажытны горад Гродна [ёсць звесткі пра Ніжнюю царкву] / М.А. Ткачоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 31.
- Трусаў, А.А. Гродзенская Ніжняя царква / А.А. Трусаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. - Т. 3. - С. 128.
- Трусаў, А.А. Гродзенская Ніжняя царква / А.А. Трусаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 187.
- Трусаў, А.А. Гродзенская Ніжняя царква / А.А. Трусаў // Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 2001. – С. 77.
- Трусаў, А.А. Ніжняя царква / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч // Трусаў А.А. Стары замак у Гродне XI – XVIII ст.ст. : гіст.-архітэктурны нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск, 1993. – С. 18.
- Трусов, О.А. Гродненская Нижняя церковь / О.А. Трусов // Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв. : архитект.-археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск, 1988. – С. 9, 28 – 30, 32, 41, 49, 82, 98, 109, 117 – 118.
- Чантурия, В.А. [Нижняя церковь] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. Архитектурные памятники Белоруссии / В.А. Чантурия. - Минск, 1982.- С. 121.
- Чантурия, В.А. [Нижняя церковь] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. - Минск, 1985.- Т.1. - С.30.

## Гродзенская Прачысценская царква

Помнік старажытнарускага дойлідства XII ст. Пабудавана майстрамі Гродзенскай школы дойлідства. 6-слуповы 3-нефавы храм (20х12,7 м.) меў тры прамавугольныя ў планеса зрэзанымі вугламі апсіды. Сцены (таўшчынёй 1–1,1 м.) былі складзены з плінфы ў тэхніцы роўнаслаёвай муроўкі. У верхнія часткі сцен і скляпенні былі ўмураваны керамічныя збанкі-галаснікі. Фасады былі аздоблены лапаткамі, мёлікавымі пліткамі квадратнай і трапецападобнай формы, устаўкамі з абчасаных паліраваных валуноў.

Падлога была выкладзена маёлікавай пліткай жоўтага, зялёнага і карычневага колераў разнастайных форм. Па сваім малюнку маёлікавая падлога царквы мае вялікае падабенства з падлогай Гродзенскай Ніжняй царквы. Слупы квадратнага сячэння са скошанымі вугламі. Фундамент складзены з невялікіх валуноў і заглыблены на 0,6 м. Царква значна пашкоджана пажарам у 1654 г. Рэшткі яе выяўлены ў 1980 г. археолагамі на тэрыторыі Гродзенскага манастыра базыльянак.

**Бібліяграфія**


- Габрусь, Т.В. [Гродзенская Прачысценская царква] / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 1. IX – XIV ст.ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2005. – 188.
- Кулагін, А.М. Царква ў імя Прасвятой (Прачыстай) Багародзіцы / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін.- Мінск., 2007. – С. 486.
- Материалы для истории древних православных церквей в Гродно: Древняя Соборная Пречистенская церковь / Гродненщина. Ч. 1. История, краеведение, этнография / автор-составитель А. Рыжий. - Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011. – в 2-х т., т. 1 – С. 162 – 174.
- Сліж, Н. З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI – XVIII ст. / Наталля Сліж // Гарадзенскі палімпсест. XII – XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Горадня, 7 лістап. 2008 г.) / пад рэд. А.Ф. Смалянчука, Н.У. Сліж. – Горадня; Беласток, 2008. - С. 64 – 95.
- Трусов, О.А. Гродненская Пречистенская церковь / О.А. Трусов // Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв. : архитект.-археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск, 1988. – С. 9, 30, 98, 101, 104 – 105, 109, 118, 123.
- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 188.
- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 170.
- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 5. - С. 428.
- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 2001. – С. 78.
- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. - Т. 3. - С. 130.

- Чарняўскі, І.М. Гродзенская Прачысценская царква / І.М. Чарняўскі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 181.


## Гродзенскі вакольны горад

Умацаваная гандлёва-рамесніцкая частка сярэдневяковай Гародні. Размяшчаўся на ўзвышшы Новы замак побач з Гродзенскім Старым замкам. З XIV ст. вядомы як Гродзенскі Ніжні замак. З поўдня абмежаваны высокім абрывам берага Нёмана, з усходу – глыбокім ярам, які да XVIII ст. амаль цалкам абкружаў Новы замак, пазней засыпаны. У 1987 – 1988 гг. А.К. Краўцэвіч даследаваў 40 м. кв. у паўднёва-заходняй частцы. Культурны пласт да 3,3 м., светла-шэрага колеру. Амаль на самым мацерыку прасочваюцца сляды пажару. Выяўлены фрагменты керамічнага посуду XII – XIII ст. (у перадмацерыковым пласце – XI ст.), вялікая колькасць прамавугольнай (28x16,5x 3,5 см.) і фігурнай плінфы, чатыры фрагменты маёлікавых плітак падлогі і тры фрагменты галаснікоў XII ст. Знаходкі дазваляюць меркаваць пра існаванне ў XII ст. на вакольным горадзе яшчэ адной (Васкрасенскай) царквы – помніка Гродзенскай архітэктурнай школы. Астатнія матэрыялы датуюцца XV – XVIII ст. Частка раскопу прыйшлася на падмурак мураванага будынка XVI ст. Паводле гравюры М. Цюндта (1567 – 1568 гг.) тут быў “каралеўскі дом”.

Сярод знаходак шмат кермічнага посуду, фрагменты фаянсавых талерак, шкляныя бутэлькі, кварты, стопкі, бутлі, слоікі XVII – XIX ст., маёлікавыя міскі і талеркі XVIII ст., шмат аптэчнага посуду XIX – XX ст. фрагменты гаршковай кафлі XIV – XV і XVI – XVII стст. з зялёнай палівай, паглыбленай выявай шматпялёсткавай разеткі і з дывановым арнаментам, металічныя абутковыя падкоўкі, дужка шпоры XV – XVI ст., цвікі і інш.

### Бібліяграфія


- Вакольны горад / У.В. Алісейчык, Я.Г. Звяруга, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, А.А. Трусаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 79.
- Краўцэвіч, А.К. Гродзенскі вакольны горад / А.К. Краўцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 189.


## Гродзенскі дом Агінскага

Існаваў у канцы XVIII - сярэдзіне XIX стст. у Гродне. Пабудаваны ў 1790 г. (арх. К. Шыльдгаўз) у стылі класіцызму з элементамі народнага дойлідства. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак з развітымі рызалітамі ў цэнтры галоўнага і дваровага фасадаў і 4 алькежамі па вуглах. У

мураваным 1-м паверсе знаходзіліся каморы і парадная двухмаршавая лесвіца. Драўляны другі паверх уключаў жылыя пакоі, залы, кухні. Асноўны аб’ём накрыты высокім чатырохсхільным чарапічным дахам. Фасады дома мелі 4-яруснае вырашэнне. Ніжні ярус (першы паверх) масіўны, з невялікімі гладкімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі, верхні (другі паверх) – больш высокі, ажурны, прарэзаны рытмічным радам шырокіх акон з ліштвамі. Рызаліт на галоўным фасадзе быў завершаны невялікім атыкам, галоўны ўваход быў аформлены стылізаваным порцікам. Не збярогся.

**Бібліяграфія**

- Гродзенскі дом Агінскага // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 171.
- Гродзенскі дом Агінскага / Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2.  -  С. 188.
- Гродзенскі дом Агінскага // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. –Т. 5. -  С. 431.
- Чантурия, В.А. [Гродненский дом Огиньского] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / Чантурия В.А. - Минск, 1985.-  Т.1. - С. 264.

## Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінак



Існавалі ў XVII – першай палове XIX стст. у гістарычным цэнтры Гродна. Пабудаваны ў 1621 г. (па фундацыі К. Сапегі) у стылі барока. У 1854 г. перабудаваны пад праваслаўны Барысаглебскі манастыр. Касцёл – аданефавы будынак з паўкруглай апсідай, завершаны двухсхільным (над апсідай паўканічным) дахам. Сцены былі расчлянёны арачнымі аконнымі праёмамі. Галоўны фасад утварала 2-ярусная вежа-званіца. Завершаная складаным па малюнку купалам. Ярусы вежы і тарцовай часткі нефа былі аформлены пілястрамі, падзелены антаблементам. Бакавыя часткі франтона нефа

вырашаны як стылізаваныя валюты і фланкіраваліся па вуглах шатровымі вежачкамі-пінаклямі.

У XIX ст. пры перабудове касцёла пад праваслаўны храм зменена завяршэнне галоўнага фасада, над цэнтральнай часткай нефа зроблены купал на васьміграннным барабане ў псеўдарускім стылі. Двухпавярховы будынак кляштара стаяў перад галоўным фасадам касцёла, меў складаную кафігурацыю плана. Аб’ёмы завяршаліся двухсхільнымі дахамі. Комплекс быў абнесены агароджай з прамавугольнай у плане 2-яруснай брамай званіцай пад 2-схільным дахам. На месцы былога Барысаглебскага манастыра, які быў разбураны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1984 г. быў пабудаваны абласны драматычны тэатр.

**Бібліяграфія**


- Кулагін, А.М. Касцёл і кляштар бернардзінак / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін.- Мінск, 2008. – С. 410.
- Якімовіч, Ю.А. Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінак / Ю.А. Якімовіч // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 174.
- Якімовіч, Ю.А. Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінак / Ю.А. Якімовіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2.  -  С. 190.


## Гродзенскі касцёл і кляштар кармелітаў босых

Знаходзіўся на вул. Маставой, побач са старажытнай плошчай Стары рынак. Драўляны кляштар фундаваны Катовічамі ў 1676 (68) г. У 1738 – 65 гг. кармеліты пабудавалі мураваны касцёл з перпендыкулярна прыбудаваным да яго жылым корпусам (верагодна арх. І. Фантана ІІІ).



Скасаваны ў 1845 (або 1848) г., у 1881 г. быў перададзены пад вайсковыя казармы 103-га Петразаводскага палка. З гэтай мэтай перабудаваўся архітэктарам Фардонам, які выканаў і абмерныя “черцяжи”. Адлюстраваны на малюнку Н. Орды 1861 – 1869 гг. Захаваўся трохпавярховы кляштарны корпус. Касцёл з’яўляўся творам архітэктуры ракако. Быў вырашаны па тыпу трохнефавай бязвежавай базілікі. Галоўны хваліста выгнуты фасад тонкапрафіляванымі карнізнымі паясамі падзяляўся на чатыры ярусы: асноўная моцна крапаваная слаістымі

пілястрамі плоскасць, атык і прамавугольны шчыт з бакавымі валютамі, фігурны франтон. Над уваходам і арачным акном над ім былі размешчаны пластычныя ляпныя картушы ў стылі ракако, у бакавых нішах-экседрах – культавая скульптура. Пласціна галоўнага фасада выходзіла за габарыты асноўнага карабля храма, што хавала яго адносна сціплую архітэктурна-пластычную тарктоўку. Мастацка-дэкаратыўным акцэнтам афармлення інтэр’ера з’яўляўся мураваны алтар з каланадай.

## Бібліяграфія


- Габрусь, Т.В. [Касцёл кляштара кармелітаў босых у Гродне] // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь – Мінск, 2001. – С. 220 - 222.
- Габрусь, Т. Як жылі босыя кармеліты / Т. Габрусь // Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Т.В. Габрусь – Мінск, 1998. – С. 138 - 141.
- Габрусь, Т.В. [Касцёл кармелітаў босых у Гродне] / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім катэксце : у 4 т. Т. 2. XV – сяр. XVIII ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – С. 283 – 285.
- Кишик Ю.Н. [Костел и монастырь кармелитов босых в Гродно] / Ю.Н. Кишик // Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Минск: Белоруская наука, 2007. – С. 129.





- Кулагін, А.М. Касцёл Святога Узвышэння Святога Крыжа і кляштар кармелітаў / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі : энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін. – Мінск, 2008. – С. 411.
- Трусов, И. Костел и монастырь кармелитов босых в Гродно, "кармелитские казармы", ныне - здание "Приорбанка" // Игорь Трусов

Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX - XX вв. / И. Трусов – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011.- С. 37 - 40.

- Гостилович, Т. Помнят старые стены / Т. Гостилович // Гродзенская праўда. - 2008. - 10 сент. - С. 27.

## Гродзенскі кляштар дамініканцаў

Існаваў у Гродне ў XVII – XIX стст. У 1630-я гады па фундацыі Ф. і К. Сапегаў пабудаваны касцёл – мураваны трохнефавы аднаапсідны храм. Фасад меў трохярусную сіметрычную кампазіцыю з дзьвума званіцамі па баках.



З 1830 г. быў касцёлам мужчынскай гімназіі, пасля 1863 г. пераўтвораны ў царкву Ямбургскага уланскага палка, раскватараванага ў Гродне. Знішчаны ў 1874 г. У 1735 г. побач з касцёлам айцом Т. Ганусевічам замест існаваўшага раней драўлянагаўзведзены мураваны будынак кляштара па вул. Віленскай (цяпер вул. Савецкая, 6). У 1760-я гг. будынак дабудаваны ўздоўж вуліцы. Двухпавярховы складаны ў плане аб’ём вырашаны па схеме, характэрнай для архітэктуры класіцызму. Галоўны фасад вырашаны рустоўкай цэнтральнай часткі першага паверха і завершаны трохвугольным франтонам, карніз якога падтрымліваюць дэнтыкулы. Накрыты двухсхільным дахам. Паверхі на фасадзе размежаваны прафіляваным пояском. Прамавугольныя вокны другога паверха завершаны сандрыкамі і невялікімі франтончыкамі. Бакавыя крылы раскрапаваны пілястрамі і завершаны ступеньчатым атыкам. Сістэма планіроўкі калідорная. У будынку кляштара працавала дамініканская школа, з 1834 г. – мужчынская гімназія і іншыя дзяржаўныя навучальныя ўстановы і ўстановы гарадскога самакіравання. Пасля Вялікай Айчыннай вайны

будынак выкарыстоўваецца як жылы будынак. Помнік рэспубліканскага значэння. У 1870-я гады на вуліцы Званіц на месцы старой драўлянай пабудовы паводле праекта Л.Грынцэвіча быў узведзены другі мураваны корпус кляштара (выкарыстоўваецца пад установы культуры).

**Бібліяграфія**


- Габрусь, Т.В. Парасткі новай эпохі [Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі дамініканцаў] / Т.В. Габрусь // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск, 2001. – С. 99.
- Маліноўская, Т.Р. Гродзенскі кляштар дамініканцаў/ Т.Р. Маліноўская // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 178.
- Маліноўская, Т.Р. Гродзенскі кляштар дамініканцаў / Т.Р. Маліноўская // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 694.
- Ярашэвіч, А.А. Гродзенскі кляштар дамініканцаў / А.А. Ярашэвіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 5. - С. 433.


## Гродзенскі княжацкі хорам (княжацкі палац)



Помнік архітэктуры XII ст. Быў пабудаваны ў Гродне на дзядзінцы. Рэшткі выяўлены Ю Ядкоўскім у 1932 – 1933 гг. Зберагласся паўночная частка даўжынёй 9, 72 м. і вышынёй да 2 м. Гэта быў двухпавярховы на каменным падмурку будынак з драўлянымі бэлечнымі перакрыццямі. Змураваны з плінфы ў тэхніцы роўнаслаёвай муроўкі. На кароткіх тарцах

цаглін рэльефныя мулярскія знакі. Дэкаратыўная муроўка звонку была аздоблена радамі амаль неапрацаваных камянёў. Падмурак – рад камянёў (таўшчыня 35 – 40 см.), пад якой знаходзіцца праслойка бітай цэглы. Унутраныя сцены былі аформлены арачнымі нішамі, падлогі аздаблялі разнастайныя па форме і колеры паліваныя керамічныя пліткі. Быў накрыты свінцовымі лістамі. У канцы XVI – пач. XV ст. да ўвахода прыбудаваны новы ганак з вялікапамернай цэглы, будынак прыстасаваны да абароны. Разбураны ў XVI ст. ў час перабудовы Старога замка Стэфанам Баторыем.

**Бібліяграфія**


- Аляксееў, Л.В. Княскі церам XII ст. / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996 – С. 22.
- Воронин, Н.Н. Крепостные башни. Южная башня [руины княжеского терема] / Н.Н. Воронин // Воронин Н.Н. Древнее Гродно. (По материалам археологических раскопок 1932 – 1949 гг.) / Н.Н. Воронин – Москва, 1954. – С. 129.
- Рэшткі княжацкага палаца / У.В. Алісейчык, Я.Г. Звяруга, А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў, А.А. Трусаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 78.
- Трусаў, А.А. Гродзенскі княжацкі палац / А.А. Трусаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 190.
- Трусаў, А.А. Гродзенскі княжацкі хорам / А.А. Трусаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 179.
- Трусаў, А.А. Гродзенскі княжацкі церам / А.А. Трусаў // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 5. - С. 435.
- Трусаў, А.А. Хорам (палац, церам) XII ст. / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч // Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI – XVIII ст.ст.: гіст.-архітэктурны нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск, 1993. – С. 19.
- Трусаў, А.А. Гродзенскі княжацкі палац / А.А. Трусаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. - Т. 3. - С. 136.
- Трусов, О.А. [Гродненский княжеский терем] / О.А. Трусов // Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв.: архитект.- археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск, 1988. – С. 28 – 30, 118 - 119.


## Гродзенскі палац Тызенгаўза

Пабудаваны ў 1760 – 70-я гады ў Гродне (арх. Ю. Мёзер, Дж. Сака, маст. П. Гежыдовіч, А. Грушэцкі і інш.). Выкарыстоўваўся як палац старосты

Гродзенскай эканоміі А. Тызенгаўза, пасля далучэння да Расіі належаў рускаму генералу Я. Сіверсу, затым князю Рэпніну, з пачатку XIX ст. быў рэзідэнцыяй губернатара.

З'яўляўся кампазіцыйным цэнтрам ансамбля Гарадніцы, размяшчаўся на плошчы, да якой быў павернуты галоўным фасадамі вялікім трапецападобным курданёрам.1-павярховы, П-падобны ў плане мураваны будынак быў накрыты высокім вальмавым дахам з невялікімі мансардамі ў цэнтры бакавых крылаў і завяршаўся авальным у плане бельведэрам з купалам і скульптурнай выявай Цэрэры над галоўным уваходам. Аздабленне фасадаў мела элементы ракако (руставаныя падвойныя лапаткі, гірлянды, картушы, абрамленні прамавугольных і арачных аконных праёмаў). У каларыстычным вырашэнні фасадаў выкарыстана спалучэнне зялёнага колеру сцен, белых ляпных дэталей, чырвонай дахоўкі. Планіроўка мяшаная: у цэнтральнай частцы анфіладная, у крылах калідорная. Парадныя залы былі аздоблены плафонамі з размалёўкай і мармуровымі разнымі камінамі з карарскага мармуру. У ансамбль уваходзіў будынак Гродзенскага тэатра Тызенгаўза, які размяшчаўся ў асобным аб'ёме, прыбудаваным да паўночна-ўсходняга боку палаца. Разбураны ў 1915 г. З паўночна-ўсхрднягя боку палаца прафесарам Ж.-Э. Жыліберам быў створаны рэгулярны батанічны сад, які па разнастайнасці, рэдкасці і колькасці відаў раслін не саступаў лепшым садам Еўропы. Калекцыя камплектавалася з рэліктаў, атрыманых па абмену з Эдынбургскага і Страссбургскага садоў. Цяпер на месцы саду гарадскі парк, які носіць імя Ж.-Э. Жылібера. Каля аднаго з уваходаў у парк размяшчаецца скульптура – выява яго заснавальніка (аўтар – У. Панцялееў), якая была створана ў 2007 годзе.



РИС 1 ФАСАД



РИС 2 ПЛАН

## Бібліяграфія


- Аляксееў, Л.В. [Гродзенскі палац Тызенгаўза] / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996. – С. 54.

- Габрусь, Т.В. Гродзенскі палац Тызенгаўза // Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Т.В. Габрусь. – Мінск, 1998. – С. 192.
- Кулагін, А.М. Гродзенскі палац Тызенгаўза / А.М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск,1993. – С. 181.
- Кулагін, А.М. Гродзенскі палац Тызенгаўза / А.М. Кулагін // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 196.
- Кулагін, А.М. Гродзенскі палац Тызенгаўза // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 5. - С. 437.
- Трусов, И. Утраченная застройка Городницы и улицы Ожешко / И. Трусов // Трусов И. Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX – XX вв. / И. Трусов. – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011. – С. 47.
- Чантурия, В.А. [Дворец А. Тизенгауза в Гродно] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. - Минск, 1985. - Т.1. - С. 155, 157.



## Гродзенскі фарны касцёл (касцёл Прачыстай Маці Боскай, фара Вітаўта)

Упершыню ўпамінаецца ў 1839 г. ў грамаце Вялікага князя Літоўскага Вітаўта, які яго заснаваў. Першы каталіцкі храм у Гродне. Знаходзіўся на заходнім баку Старога рынка (сучасная пл. Савецкая). Спачатку быў драўляны. На гравюры М. Цюндта аднанефавы прамавугольны ў плане будынак, накрыты двухсхільным дахам. На паўднёва-ўсходнім вугле знаходзілася высокая круглая шмат'ярусная вежа. У 1584 – 1587 гг. на месцы драўлянага быў пабудаваны мураваны касцёл на сродкі караля Стэфана

Баторыя, які хацеў быць у ім пахаваны. Вядома, што ў будаўніцтве касцёла прымаў удзел муляр з Італіі Антоні Дзігрэп. У выніку перабудовы храм атрымаў гатычна-рэнесансны выгляд. Які зафіксаваны на гравюры Т. Макоўскага (1600 г.). Гэта быў трохнефавы прамавугольны ў плане будынак. Цэнтральны неф пераходзіў у больш нізкі прэсбітэрый, завершаны трохграннай алтарнай апсідай. Галоўны фасад быў вылучаны прамавугольнай у плане чатырох’яруснай вежай-званіцай, завершанай фігурным купалам. Па баках да яе прымыкалі дзве баявыя вежы з вітымі ўсходамі, што вялі на хоры. З поўначы да прэсбітэрыя прымыкала сарысція, з поўдня – капліца. Бакавыя сцены былі ўмацаваны контрфорсамі ў выглядзе пілястраў, аб’яднаных уверсе аркамі, і прарэзаны вузкімі стральчатымі аконнымі праёмамі. Па сваіх памерах гэта быў самы вялікі храм сярод




аналагічных яму на Беларусі (даўжыня каля 58,6 м., шырыня каля 23 м.). Касцёл шматразова перабудоўваўся (пажары 1753, 1782, 1892 гг.), у 1804 г. храм быў перададзены праваслаўнай царкве, адрамантаваны і ў 1807 г. асвячоны ў імя св. Сафіі. Пасля пажару 1892 г. перабудаваны (1896 - 1899) ў псеўдарускім стылі паводле праекта акадэміка архітэктуры М. Чагіна. Храм меў пяць цыбулепадобных купалоў на высокіх барабанах, ніжэй якіх пабудову апяразвалі какошнікі. З поўначы быў дабудаваны яшчэ адзін прыдзел, з усходу да алтарнага выступу – апсіда. Вежа стала значна вышэйшай. З 1919 г. храм вернуты каталікам і выкарыстоўваўся як гарнізонны касцёл. Дзве перабудовы пасля пажару 1923 г. (арх. В. Генеберг) і ў 1935 г. (арх. А. Сасноўскі) надалі яму рысы раманска-гатычнага храма.. Пасля Другой сусветнай вайны касцёл не дзейнічаў. 29 лістапада 1961 г. быў узарваны, на гэтым месцы цяпер сквер і дошка гонару.

**Бібліяграфія**


- Габрусь, Т.В. Гродзенскі фарны касцёл / Т.В. Габрусь, У.М. Дзянісаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-ці т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мнінск, 1985. - Т. 2. - С. 198 - 199.
- Габрусь, Т.В. [Фарны касцёл у Гродна (фара Вітаўта)] / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. Т. 2. XV – сяр. XVIII ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Бел. навука, 2006. – С. 163.
- Габрусь, Т.В. Фарны касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі ў Гродне (фара Вітаўта) / Т.В. Габрусь // Габрусь Т.В. Мураваныя харалы. Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мнінск, 2001. – С. 66 - 69.
- Кишик, Ю.Н. Накопление архитектурных доминант. XVII - XVIII века / Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно / Ю.Н. Кишик - Минск, 2012.- С. 78 - 97.
- Кулагін, А.М. Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі [фара Вітаўта] / А.М. Кулагін // Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі: энцыкл. даведнік / А.М. Кулагін – Мнінск, 2008. – С. 410 - 411.
- Кушнярэвіч, А.М. Гродзенскі фарны касцёл / А.М. Кушнярэвіч, А.У. Мілінкевіч, Е. Пашэнда // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мнінск,1993. – С. 182.
- Кушнярэвіч, А.М. Гродзенскі фарны касцёл / А.М. Кушнярэвіч, А.У. Мілінкевіч, Е. Пашэнда // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск, 1997. – Т. 5. - С. 439 - 440.
- Кушнярэвіч, А.М. Храмы-базілікі [фарны касцёл (фара Вітаўта) у Гродне] / А.М. Кушнярэвіч. Культавае дойлідства Беларусі XIII – XVI стст. : гіст. і арх.-археал. даслед. / А.М. Кушнярэвіч – Мінск : Навука і тэніка, 1993. – 124.






- Марціновіч, А. Фара Вітаўта // Горадна, Горадзен, Гродна: нарысы / аўт. тэксту А.Марціновіч; фотаздымкі А. Ласмінскага. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – С. 34 – 37.

- Мілінкевіч, А. Гродзенскі фарны касцёл / Аляксандр Мілінкевіч, Ежы Пашэнда // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск, 1996. - Т. 3. - С. 142.
- Мілінкевіч, А.У. Гродзенскі фарны касцёл Прачыстай Божай Маці (фара Вітаўта) / А.У. Мілінкевіч, Е. Пашэнда // Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш.; маст. А.А. Глекаў. – Мінск : БелЭн, 2001. - С. 82.
- Трусов, И. "Фара Витовта", Софийский собор, Гарнизонный костел / ИгорьТрусов // Трусов И. Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX - XX вв. / І. Трусов – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011.- С. 15 - 25.
- Чантурия, В.А. [Костел фарный (Фара Витовта)] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. - Минск, 1985.- Т.1. - С. 102, 103.
- Шматпакутная "Фара Вітаўта" // Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Т.В. Габрусь – Мінск, 1998. – С. 71 - 75.

- Козырев, В. До и после взрыва : Судьба Фары Витовта / В. Козырев // Перспектива. - 2012. - 21 марта. - С. 17.

## Гродзенскі чыгуначны вакзал

Пабудаваны да 1867 г. Меў элементы стылю класіцызму. Строга сіметрычная аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя прамавугольнага ў плане будынка складалася з цэнтральнай двухпавярховай часткі, злучанай аднапавярховымі галерэямі з двума бакавымі аднапавярховымі крыламі. Кампазіцыя фасадаў заснавана на рытме паўкалон, пілястраў тасканскага ордэра, прамавугольных і арачных акон. Прасценкі паміж буйнымі арачнымі вокнамі акавых крылаў дэкарырываны рустам. У гады Вялікай Айчыннай вайны будынак разбураны, у 1948 адноўлены. Над галерэямі пабудаваны другі паверх. Да бакавога крыла прыбудаваны двухпавярховы корпус са службовымі і дапаможнымі памяшканнямі. Атык цэнтральнай часткі быў заменены на франтон. У 1986 будынак быў разбураны ў сувязі з будаўніцтвам новага вакзала.

### Бібліяграфія

- Валошын, В.В. Чыгуначны вакзал / В.В. Валошын // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобл. / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў і інш. – Мінск, 1986. – С. 82.
- Гродзенскі чыгуначны вакзал // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск., 1993. – С. 183.

- Трусов, И. Первый железнодорожный вокзал на территории Беларуси / Игорь Трусов // Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX - XX вв. / И. Трусов – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011. - С. 60 - 68.

- Ивановский, В. Загадки гродненской "железки" / В. Ивановский // Перспектива. - 2008. - 14 авг. - С. 28.
- Саяпин, В. История привокзальной площади [в Гродно] / В. Саяпин // Вечерний Гродно. - 2010. - 29 сент. - С. 34.





## Гродзенскія корчмы

Пабудаваны ў 1770-я гады на галоўнай магістралі Гарадніцы (арх. Ю. Мёзер, Дж. Сака). Карчма **“Галеча”** складалася з кампактнага двухпавярховага мураванага будынка гасцініцы і выцягнутай прамавугольнай у плане драўлянай стайні з цагляным каркасам, якая прылягала да дваровага фасада гасцініцы. Будынкі былі накрыты высокімі двухсхільнымі дахамі. Уваход у гасцініцу вылучаўся цэнтральным рызалітам з фігурным франтонам.



Гродзенскія корчмы «Галеча» (злева) і «Раскоша».

Карчма **“Раскоша”** мела сіметрычную кампазіцыю, складалася з трох аднапавярховых квадратных у плане аб’ёмаў, якія прылягалі адзін да аднаго вугламі і ўтваралі паўадкрыты двор. У цэнтральным аб’ёме размяшчалася гасцініца, у бакавых – стайні. Фасад гасцініцы быў аздоблены лапаткамі і завяршаўся лучковым атыкавым франтонам, які закрываў тарэц

двухсхільнага даху з мансардай. Стайні былі накрыты пакатымі чатырохсхільнымі дахамі, сцены аздоблены руставанымі лапаткамі.

Карчма **“Выгода”** складалася з двухпавярховага кампактнага накрытага дахоўкай мураванага будынка гасцініцы з балконамі на ўзроўні другога паверха і прамавугольнай у плане гаспадарчай прыбудовы, у якой размяшчалася стайня, кладавыя і вялікая саладоўня. **“Галеча”** і **“Выгода”** знесены ў канцы XIX ст. **“Раскоша”** знішчана пад час рэканструкцыі вуліцы Ажэшкі.



## Бібліяграфія


- Габрусь, Т.В. Гродзенскія корчмы / Т.В. Габрусь // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 202.
- Габрусь Т.В. Гродзенскія корчмы / Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 184.
- Трусов, И. Квартал улиц Социалистической, Ожешко, Городничанской, Карбышева / Игорь Трусов // Трусов И. Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX - XX вв. / И. Трусов. – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011.- С. 69 - 74.
- Чантурия, В.А. [Гродненские корчмы] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. - Минск., 1985.- Т.1. - С. 150 - 151

- Ивановский, В. От "Раскоши" мимо "Нищеты" к "Золотому копыту" / В. Ивановский // Перспектива. - 2006. - 9 лют. - С. 3.
- Мурина, С. "Раскоша" и "Галеча" на гродненских улицах / С. Мурина // Гродзенская праўда. - 2011. - 5 студз. - С. 12.

# Гродзенскія муры

Рэшткі мураваных сцен XII ст. на тэрыторыі Гродзенскага Старога замка. Узведзены на грэбені старажытнага вала, мелі абарончаеі часткова дэкаратыўнае прызначэнне. У 1937 годзе польскія археолагі выявілі ў паўночна-заходняй частцы дзядзінца фрагмерт складзенай з плінфы сцяны даўжынёй кала 4,5 м., вышынёй каля 1, 8 м. У 1949 годзе фрагмент сцяны абследаваў М.М. Варіонін і выказаў меркаванне, што гэта рэшткі вуглавой абарончай вежы гродзенскага дзядзінца. У 1981 годзе муры даследавалі П.А. Рапапорт і А.А. Трусаў, у 1985 – 1986 гг.  – А.А. Трусаў, П.А. Рапапорт, М.А. Ткачоў, Л.М. Бальшакоў, А.К. Краўцэвіч, у 1988 г. – А.А. Трусаў. Даўжыня выяўленай часткі сцяны каля 12 м. У 1988 г. развал сцяны на паўночным схіле Замкавай гары прасочаны на працягу 20 – 22 м. Даўжыня цаглянага муру ў гэтай частцы старажытнага дзядзінца некалі раўнялася 42 – 45 м. Муроўка захавалася на вышыні каля 0, 6 м. Сярэдняя частка сцяны часткова разбурана будаўніцтвам гатычнага каземата XV ст. (разбураны, відаць, у XVI ст., спаленая драўляная яго падлога ляжыць непасрэдна на развале старажытнай муроўкі). Сцяна практычна не мае падмурка і збудавана на тонкай праслойцы будаўнічага друзу. Тэхніка муроўкі роўнаслаёвая. Памеры плінфы 27 – 29 х 16,5 – 18 х 3,5 – 4,5 см. Яна добра абпалена, некаторыя цагліны плінфы маюць на тарцах выпуклыя знакі ў выглядзе літар і розных геаметрычных фігур (найчасцей літары А, Б, В). У муроўцы выкарыстаны розныя тыпы лякальнай плінфы: трапецападобная, з паўкруглым канцом і інш. Плінфа пакладзена на вапнавай рошчыне з дабаўленнем цамянкі, гарызантальныя швы паміж цаглінамі прыкладна роўныя па таўшчыні цаглінам. Таўшчыня цаглянага муру 1,4 – 1,5 м. Захаваліся дзве скразныя круглыя адтуліны дыяметрам 15 см. ад падоўжаных драўляных сувязей, якія выкарыстоўваліся ў якасці арматуры. У час раскопак пад сцяной на схіле Замкавай гары выяўлены фрагменты былога муру. Яго памеры і суадносіны з рэшткамі сцяны дазваляюць меркаваць, што вышыня цаглянага муру была не менш за 5 метраў. Прымаючы пад увагу, што фундамент цэглы падобны да цэглы Гродзенскага княжацкага палаца, можна меркаваць, што мур узведзены ў XII стагоддзі. Глыбіня развалу сцяны на паўночным схіле дзядзінца 1,9 – 2 м. ад сучаснай дзённай паверхні. Сама сцяна загінула ў выніку вялікага пажару, верагодна, звязанага з ваеннымі дзеяннямі, пра гэта сведчыць знаходка шпоры XIII - XIV стагоддзяў у пласце пажару пад развалам сцяны XII ст.

Рэшткі яшчэ аднаго цаглянага муру XII ст. выявілі ў 1986 годзе А.А. Трусаў і М.А. Ткачоў ва ўсходняй частцы дзядзінца каля палаца XVI ст. Сцяна складзена з плінфы розных памераў, у муроўцы таксама выкарыстана трапецападобная цэгла (некаторыя з плінфы маюць на тарцы знакі). Фармат плінфы прыблізна роўны 4х16х29 см. Даўжыня выяўленага фрагмента муроўкі 6 м., далейшы працяг сцяны ідзе на ўсходні профіль раскопу. Шырыня сцяны 1 – 1,3 м., захавалася на вышыні да 1,6 м., не мае падмурка, праходзіла па старажытным схіле Замкавай гары. Непасрэдна пад сцяной на

глыбіні каля 2,8 м. ад сучаснай дзённай паверхні ідзе праслойка з белага пяску таўшчынёй 0,2 – 0,3 м. Пад ёй выяўлены сляды моцнага пажару. Відаць, пасля яго, калі былі знішчаны драўляныя ўмацаванні замка, і была ўзведзена мураваная сцяна з плінфы. Калі загінула гэта сцяна, дакладна не вызначана, але ў час будаўніцтва палаца XVI ст. яе часткова разбурылі і засыпалі тоўстым пластом зямлі.

## Бібліяграфія


- Аляксееў, Л.В. Гара "Стары замак" / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў – Мінск, 1996. – С. 15.
- Ткачоў М.А.[Старажытны мур] / М.А. Ткачоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 32 - 33.
- Трусаў А.А. Гродзенскія муры / А.А. Трусаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкл.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 191 - 192.
- Трусаў А.А. Мураваныя сцены XII ст. / А.А. Трусаў // Трусаў А.А. Стары замак у Гродне XI – XVIII ст.ст. : гіст.-архітэктурны нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск, 1993. – С. 19 – 22.
- Трусов О.А. [Гродненская каменная стена XII в.] / О.А. Трусов // Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв. : архитект.-археологический анализ / О.А. Трусов – Минск, 1988. – С. 9, 30 – 31, 114.


# Гродзенскія пасады

Гандлёва-рамесныя часткі сярэдневяковай Гародні XI – XVIII ст. **Цэнтральны пасад** размяшчаўся на тэрыторыі абмежаванай з захаду і поўначы ракой Гараднічанкай, з усходу прыродным ярам і з поўдня правым берагам Нёмана. Даследавалі ў 1971 г. Я.Г. Звяруга, у 1971 і 1980 – 1983 гг. М.А. Ткачоў, у 1980 – 1981 гг. І.М. Чарняўскі, у 1983 г. і 1987 г. А.М. Краўцэвіч, у 1987 – 1990 гг. Р.А. Акінчыц. Культурны пласт светла- і цёмна-шэры, залягае нераўнамерна: уздоўж вул. Замкавай ад 0,4 – 0,6 м. да 2 м. і больш, на падворку былога манастыра базыльянак 2 м., за Савецкай плошчай (вул. К. Маркса) да 1, 5 м., звычайна перамяшаны ў выніку інтэнсіўнага будаўніцтва ў XVIII – пач. XX ст. Самыя старажытныя матэрыялы (фрагменты штрыхаванай керамікі пачатку 1-га тысячагоддзя нашай эры) выяўлены ў раёне касцёла бернардзінцаў. Участак на паўночны ўсход ад дзядзінца (каля пажарнага дэпо) і Падол (цяпер вул. Падольная) заселены ў XI – XII ст. У раёне касцёла бернардзінцаў, каля пажарнага дэпо і на падворку манастыра базыльянак знойдзена кераміка XI ст. На тэрыторыі манастыра базыльянак выяўлены таксама рэшткі Прачысценскай царквы. (XII ст.). Не ўдалося вычленіць пласт XIV ст., што сведчыць пра заняпад жыцця ў гэты час з прычыны эпідэмій і частых войнаў з крыжакамі.У XVI – XVII ст. з захаду, поўначы і ўсходу пасад абведзены гліняна-пясчаным валам, узведзены Віленская, Лідская (Смаленская) і Падольная брамы.

Сярод знаходак XVI – XVIII ст. керамічны посуд (гаршкі, міскі, талеркі, кубкі, збаны, макотры і інш.), падсвечнікі, люлькі, скарбонка, маёлікавы посуд (талеркі, міскі, паўміскі), фаянсавыя талеркі з кобальтавай размалёўкай. Многа пячной кафлі: гаршковая з круглым вусцем (XIV – XV ст.), з прамавугольным вусцем (XV – XVI ст.), каробчатая з раслінным, геаметрычным, геральдычным арнаментам; тэракотавая, зялёнапаліваная і паліхромная. Вылучаецца кафля другой паловы XVI ст. з паглыбленай выявай шматпялёсткавай разеткі, каронка з выявай воіна канца XVI – пач. XVII ст. Трапляецца размаляваная кафля XVIII ст. Знойдзены манеты XVII ст., цвікі, нажы, замкі, падкоўкі, ключы, вырабы са шкла (бутэлькі, бутлі, шклніцы, кварты, чаркі, стопкі, келіхі).

Каложскі пасад знаходзіўся на высокім правым беразе Нёмана, на захад ад Замкавай гары, быў аддзелены ад яе ракой Гараднічанка. Даследавалі ў 1971 – 1973 гг. Звяруга, у 1983 – 1984 гг. А.А. Трусаў. Культурны пласт 0,4 – 2,2 м. Знойдзена кераміка XI ст., скарб сельскагаспадарчых прылад XIII ст. Выяўлены рэшткі зямлянкавых і паўзямлянкавых жытлаў з развaламі печаў-каменак. У 2-й палове XII ст. на пасадзе пабудавана Барысаглебская царква. На левым беразе Нёмана знаходзіўся Занёманскі пасад. Даследаваў у 1983 г. Ткачоў (праведзена шурфоўка ўздоўж вул. Дарвіна і каля касцёла францысканцаў). Самыя раннія знаходкі - ганчарная кераміка XV – XVIст., што сведчыць пра засяленне пасада ў XV ст.



## Бібліяграфія


- Аляксееў,Л.В. Гістарычная планіроўка Гродна / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск, 1996 – С. 20.
- Воронин, Н.Н. Материальная культура Гродно конца XI – начала XIII вв. // Воронин Н.Н. Древнее Гродно. (По материалам археологических раскопок 1932 – 1949 гг.) / Н.Н. Воронин. – Москва, 1954. – С. 34 – 45.
- Гродна // Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Т.В. Габрусь – Мінск, 1998. – С. 314 - 328.
- Гродно // Города, местечки и замки Великого княжества Литовского: энциклопедия / ред. совет: Т. В. Белова и др. – Минск, 2009. – С. 127 – 132.





- Кишик, Ю.Н. Исходная ячейка Гродно / Ю.Н. Кишик // Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Минск, 2007. – С. 20 – 29.
- Кишик, Ю.Н. Планировочная структура долокационного города / Ю.Н. Кишик // Кишик Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно : атлас архитектурных чертежей и рисунков : учеб.-метод. пособие / Ю.Н. Кишик. – Минск, 2012. – С. 8 – 39.
- Кишик, Ю.Н. Ансамбль средневекового города / Ю.Н. Кишик // Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно : атлас архитектурных чертежей и рисунков : учеб.-метод. пособие / Ю.Н. Кишик. – Минск, 2012. – С. 40 - 77.
- Краўцэвіч, А.К. Гродзенскія пасады / А.К. Краўцэвіч, М.А. Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкл.: В.В. Гетаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 191 - 192.
- Марозава, С.В. Гродна ў XII – пачатку XIII ст. / С.В. Марозава // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 45 – 48.
- Ткачоў, М.А. Старажытны горад Гродна / М.А. Ткачоў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 31 -44.
- Чантурия, В.А. [Дома жилые] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия - Минск, 1985.- Т.1. - С. 51, 52, 53.
- Чантурия, В.А. [Застройка] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия. - Минск, 1985.- Т.1. - С. 50, 51.
- Чантурия, Ю.В. [Планировка застройки Гродно в XI – XIII вв., в т. ч. посадов] / Ю.В. Чантурия // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва

ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 1. IX – XIV ст.ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2005. – 98 – 100.

## Гродзенскія ратушы

Назва двух помнікаў грамадзянскай архітэктуры Гродна, якія існавалі ў канцы XV – першай палове XX ст. Драўляная ратуша была пабудавана ў 1496 г. на гандлёвай плошчы. Мела рысы стылю рэнесансу. Была двухпавярховая, асіметрычнай кампазіцыі (у ніжнім паверсе крамы і склады, у верхнім – зала пасяджэнняў магістрата), з адкрытай абходнай галерэяй на другім паверсе, завяршалася дзьвума вежамі (высокай ярусней з дазорнай пляцоўкай уверсе і больш нізкай у тарцы корпуса). Не зберагласа. Мураваны комплекс ратушы і гандлёвых радоў пабудаваны ў 1807 г. на Парадной плошчы ў стылі класіцызму. Аднапавярховыя гандлёвыя рады замкнёнай кампазіцыі ўтваралі ў цэнтры прамавугольную ў плане плошчу. Па папярочнай восі комплексу ўзвышаліся два двухпавярховыя аб'ёмы ратушы (адзін арыентаваны на Парадную плошчу, другі – на Нёман). Фасады аб'ёмаў вылучаны шасцікалоннымі порцікамі дарычнага ордэра з круглымі канеліраванымі калонамі на прамавугольным у плане цокалі, антаблементамі з трыгліфамі і карнізамі на сухарыках, трохвугольнымі франтонамі ў завяршэнні.  Комплекс разбураны пасля 1945 года.




### Бібліяграфія


- Аляксееў, Л.В. Плошча рынку / Л.В. Аляксееў // Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў.  – Мінск, 1996. – С. 42.
- Гарадзену надаецца магдэбургскае права [ёсць звесткі пра гродзенскія ратушы] // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Гродна. – Мінск, 2000. – С. 66 – 68.
- Маріцновіч, А. Магдэбургскае права. Ратуша. Герб / А. Марціновіч // Гродна. Горадзен. Гродна : нарысы / аўт. тэксту А. Марціновіч; фотаздымкі А. Ласмінскага. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – С. 30 – 33.
- Морозов, В.Ф. [Гродненская ратуша] / В.Ф. Морозов // Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 3. XV – сяр. XVIII ст. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – С. 237.

- Трусов, И. Советская площадь / Игорь Трусов // Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX - XX вв. / И. Трусов – Гродно : ООО ЮрСаПринт, 2011.- С.10 - 14.
- Чантурия, В.А. [Ратуша с торговыми рядами] / В.А. Чантурия // Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии : в 2 т. / В.А. Чантурия - Минск, 1985.- Т.1. - С. 145, 146, 148.
- Якімовіч, Ю.А. Гродзенскія ратушы / Ю.А. Якімовіч // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл.; рэдкал..: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 185.
- Якімовіч, Ю.А. Гродзенскія ратушы / Ю.А. Якімовіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-і т. / гал. рэд. І.П. Шамякін. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 202.



- Кардэль, Ю.В. Самакіраванне ў Гродна (канец XV - XVIII стст.) [дыплом. работа] / Ю.В. Кардэль. - Гродна, 2011. – 67 с. : іл.
- Ушкевич, П. Такие были времена : [история лесопользования, торговли и быта в Гродно и обл. в 17 в.] / П. Ушкевич // Перспектива. - 2012. - 6 июля. - С. 7.




## Оглавление

Гродзенская Верхняя царква ........ 1
Гродзенская зала сеймаў ........ 2
Гродзенская ніжняя царква ........ 3
Гродзенская Прачысценская царква ........ 5
Гродзенскі вакольны горад ........ 7
Гродзенскі дом Агінскага ........ 7
Гродзенскі касцёл і кляштар бернардзінак ........ 8
Гродзенскі касцёл і кляштар кармелітаў босых ........ 9
Гродзенскі кляштар дамініканцаў ........ 11
Гродзенскі княжацкі хорам (княжацкі палац) ........ 12
Гродзенскі палац Тызенгаўза ........ 13
Гродзенскі фарны касцёл (касцёл Прачыстай Маці Боскай, фара Вітаўта) ........ 15
Гродзенскі чыгуначны вакзал ........ 18
Гродзенскія корчмы ........ 19
Гродзенскія муры ........ 21
Гродзенскія пасады ........ 22
Гродзенскія ратушы ........ 25